Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 20 (777) ● Пятніца, 29 мая 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

ЗАПРАШАЕ АГІТПУНКТ

Мабыць, самае утульнае месца у геаграфічным корпусе цяпер — агітпункт. Тут прасторна і светла. Супрацоунікі бібліятэкі паклапаціліся аб тым, каб кожны дзень наведвальнікі маглі прагледзець самыя свежыя і разнастайныя газеты і часопісы, літаратуру да выбараў і па іншай тэматыцы.

Вялікую работу вядзе калектыў агітатараў з матэматычнага, гістарычнага, хімічнага і іншых факультэтаў пад кіраўніцтвам А. А. Сідарэнкі.

З лекцыямі перад агітатарамі і выбаршчыкамі ужо выступілі многія выкладчыкі універсітэта. Так, дацэнт юрфака А. Т. Лейзерау расказау аб савецкай выбарчай сістэме, дацэнт С. Р. Віхарау прысвяціу сваё выступленне Савецкай Канстытуцыі. На пытаннях міжнароднага становішча сканцэнтравалі увагу дацэнт кафедры палітэканоміі В. П. Васін, аспірант гэтай жа кафедры М. Л. Амельяновіч. З лекцыяй аб У. І. Леніне «Самы чалавечны чалавек» выступіу дацэнт Г. Г. Герасіменка.

У клубе геафака для выбаршчыкаў дэманструюцца цікавыя дакументальныя і мастацкія фільмы.

У гэтыя дні агітатары разам з членамі выбарчай камісіі удакладняюць спісы выбаршчыкаў, наведваюць іх дома, арганізуюць гутаркі аб кандыдатах у дэпутаты Вярхоунага Савета СССР. Кожны чацвер на сваіх нарадах агітатары абмяркоуваюць наспеушыя пытанні, вызначаюць напрамкі дзейнасці.

Добрасумленна адносяцца да адказнага даручэння агітатары А. І. Куляшоу, М. Л. Гарбенка, Г. С. Асташонак, М. П. Аношка, Т. Я. Майракава і многія іншыя.

Цяпер намаганні усяго калектыву агітпункта накіраваны на тое, каб дзень выбараў у Вярхоуны Савет СССР прайшоу як вялікае і радаснае свята адзінства савецкіх людзей.

Т. ПАРМОН.

ГАРАЧАЯ ПАРА

Вясенняя залікова-экзаменацыйная сесія у нас пачалася раней, чым на іншых факультэтах. І гэта зразумела: летам будучыя геолагі і географы павінны выканаць вялікі аб'ём практычных работ у палявых умовах, таму вучэбныя заняткі заканчваюцца яшчэ ў красавіку—маі, а у маі—чэрвені студэнты выязджаюць на шырокі прастор нашай краіны, каб практычна замацаваць тыя уменні і навыкі, якія атрымалі у час тэарэтычных заняткаў у сценах універсітэта.

Залікі і экзамены, якія ідуць цяпер на факультэце (а ў некаторых групах ужо завершаны) сведчаць аб тым, што большасць студэнтаў у навучальным годзе атрымала трывалыя веды па спецыяльных дысцыплінах. Гэта зафіксавана у залікова-экзаменацыйных ведамасцях высокімі адзнакамі.

Студэнты II курса аддзялення геалогіі В. Макарук, В. Сіліч, В. Хайнак, III курса гэтага ж аддзялення — А. Акулевіч, А. Пётух здалі усе экзамены толькі на выдатна. Глыбокія і упэуненыя адказы на экзаменах даюць студэнты IV курса аддзялення геаграфіі М. Вальчык, А. Бортнік і іншыя.

Але у ходзе сесіі выяуляюцца і некаторыя слабыя месцы. Даволі высокая удзельная вага здавальняючых адзнак па навуковаму камунізму. Лепшага варта было б чакаць і ад экзаменау па замежнай мове.

Сесія праходзіць на факультэце у асноўным паспяхова. Людна цяпер у вучэбных кабінетах, ля геаграфічных карт. Гарачая пара адчуваецца ва усім напружаным рытме працы факультэта. Скора перад дзяржаунай экзаменацыйнай камісіяй будуць даваць справаздачу нашы выпускнікі. А студэнты аддзялення геалогіі ужо гатовы ў дарогу, каб ў гарах Крыма на практыцы замацаваць атрыманыя веды.

В. ЖУЧКЕВІЧ,
намеснік дэкана геаграфічнага факультэта.



Залік па матэматычнаму аналізу ў першакурснікаў матфака прымае выкладчык Н. Ф. Наумовіч. Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ДОБРЫ ПАЧАТАК

У аудыторыі, чытальныя залы і кабінеты журфака паунапраунай гаспадыняй прыйшла сесія. Асабліва хвалюе і заклапочвае яна нас, першакурснікаў. Многіх можна сустрэць з разгорнутай кнігай на калідоры, ля падаконнікаў. Гэта верная прыкмета таго, што непадалёк, на дзвярах аудыторыі вісіць папярэджанне: «Ціха, залік!»

На першым курсе ужо ёсць поспехі. Здадзены залікі па спецыяльных прадметах: машынапісу і фотасправе. Старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Георгій Захаравіч Бягун з асаблівай пахвалой адзываецца аб фотаработах Віктара Жука. Усе заданні ён выканау толькі на выдатна. З добрымі навыкамі у фотасправе прыйшлі на залік Валерый Дранчук, Міхаіл Шульман, Пётр Сабіна. Па усіх тэмах яны атрымалі выдатныя адзнакі. Сярод дзяучат-першакурсніц лепшыя фотаздымкі зрабіла Людміла Цітова. Яны выдзяляюцца не толькі добрай тэхнікай выканання, але і мастацкай задумай, кампазіцыяй.

Гэтымі днямі студэнты першага курса здалі залікі па зарубежнай літаратуры, замежнай мове, тэорыі і практыцы савецкай журналістыкі. Пачатак добры, Так трымаць і далей!

М. ІНІН,
староста I курса журфака.

НА ЗДЫМКУ: студэнткі II курса хімфака Л. МАКУШАВА і А. КЛІНКОВА на лабараторных занятках. Фота Д. ЧАХОВІЧА.



ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

З ГАЫБОКІМ РАЗУМЕННЕМ СПРАВЫ

Камуністы біяфака на сваім справаздачна-выбарным сходзе з задавальненнем адзначылі, што юбілейны ленінскі год акумуліраваў жыццёвую энергію калектыву факультэта. Студэнты, прафесары і выкладчыкі, абслугоўваючы персанал працавалі роуна і зладжана. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, павелічэнне колькасці выдатнікаў, паляпшэнне навуковай працы студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама навуковага працэсу ў цэлым. Толькі на рэспубліканскі агляд студэнтамі было прадстаўлена 44 работы, з якіх 30 аднесены да першай катэгорыі.

Прыемна было слухаць прысутным, што шмат увагі партыйнае бюро удзяляла палітыка-выхаваўчай, культурна-масавай, спартыўнай і абаронна-масавай рабоце. Пры гэтым дзейнасць камуністаў у гэтых напрамках вызначаецца стабільнасцю. Увесь універсітэт ведае насценную газету факультэта, якая заўсёды спаборнічае з «Журналістам» і часта, як і ў гэтым годзе, выходзіць пераможцай.

Партыйным сходам было адзначана набліжэнне камуністаў да студэнцкага асяроддзя, іх імкненне быць не толькі настаунікамі малодшых, але і памочнікамі.

На сходзе не толькі канстатавалася дасягнутае. У дакладзе і у выступленнях камуністаў былі выказаны слушныя прапановы і заўвагі аб далейшым паляпшэнні партыйнай работы. Партыйны сход сур'ёзна выказаўся супраць шматтэмнасці ў навукова-даследчай працы. У сувязі з гэтым прызнана памылкай, што да гэтага часу мала ўвагі ўдзяляецца пытанням укаранення ў вытворчасць вынікаў навуковых пошукаў, а кафедры і праблемная лабараторыя да гэтага часу не прыступілі да выканання гаспадарча-дагаворных работ.

У дакладзе і у выступленнях камуністаў А. А. Малама, Е. П. Кесаравай, П. Р. Пятровіча, Р. К. Апярэнка і іншых былі выказаны думкі аб перспектыўным развіцці факультэта. Было адзначана, што патрабуе паляпшэння куратарская работа. Некаторыя выкладчыкі спрошчана разумеюць свае абавязкі, часта замяняючы палітінфармацыі простым чытаннем газет. Малацікавымі былі заняткі філасофскага семінара.

Сход канстатаваў, што патрабуе радыкальнага паляпшэння культурна-масавая работа. У гэтай сувязі неабходна ўзгадніць работу грамадскіх арганізацый, таму што факультэцкая самадзейнасць, быт і адпачынак студэнтаў патрабуюць пастаяннага кантролю. Партыйнае бюро выказала папрок камітэту камсамола, які, нягледзячы на неаднаразовыя папярэджанні, не змог выявіць людзей, якія б арганізоўвалі дзейнасць мастацкіх калектываў рэгулярна і зладжана. Тым больш, што вопыт работы у камсамольцаў біяфака вялікі. Напрыклад, дружына факультэта па ахове грамадскага парадку лічыцца адной з арганізаваных і дысцыплінаваных, лектарская група студэнтаў мае на сваім рахунку 35 выступленняў, агітбрыгада не раз выязджала у падшэфную школу у Стаўбцы.

Сход прызнаў работу партыйнага бюро здавальняючай. Сакратаром партыйнага бюро зноу абран А. С. Шуканаў. Патрэбна адзначыць, што ужо гэты факт дае магчымасць меркаваць, што праца бюро сапрауды адзначана па-дзелавому, канкрэтна і па заслугах.

А. СЛУКА.

Адбыліся справаздачна-выбарныя сходы на большасці факультэтаў. Сакратарамі партыйных бюро выбраны: хімічнага — Міхаіл Пятровіч ГІЛЕВІЧ, фізічнага — Сяргей Андрэевіч КІСЛЯКОЎ, юрыдычнага — Сцяпан Рыгоравіч ДРАБЯЗКА, матэматычнага — Іван Аляксеевіч Прусаў, прыкладной матэматыкі — Мікалай Антонавіч ЛУКАШЭВІЧ.

Сёння ў нас у гасцях газета самага маладога ў рэспубліцы універсітэта. З матэрыялаў, змешчаных на гэтых старонках, мы даведваемся аб навуковых інтарэсах, сяброўстве са школамі, працоўных справах і спартыўных дасягненнях універсітэцкага калектыву.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

САДРУЖНАСЦЬ МАТЭМАТЫКАЎ

Многа важных праблем устае перад калектывам нашага маладога універсітэта ў адказны перыяд яго станаўлення. Матэматычныя кафедры ў ліку важнейшых задач бачаць не толькі забеспячэнне вучэбнага працэсу, але і далейшае развіццё навуковых даследаванняў па матэматыцы і яе дадатках з магчыма больш шырокім уцягненнем моладзі. У гэтым напрамку ужо нямала зроблена. Многія студэнты механіка-матэматычнага факультэта далучаюцца да навуковых даследаванняў, актыўна удзельнічаюць у рабоце навуковых гурткоў СНТ, спецсемінараў. Навуковыя напрамкі вызначаюцца саставам кафедр. Немалаважныя пры гэтым і магчымасці кантактаў з іншымі навуковымі калектывамі.

Перспектыўнай у нашых умовах з'яўляецца вялікая і важная галіна матэматыкі— тэорыя звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў. Даследаванні па праблемах гэтай тэорыі вядуцца ў многіх гарадах рэспублікі (уключаючы Гомель) вялікім калектывам беларускіх матэматыкаў пад кіраўніцтвам Героя Сацыялістычнай Працы акадэміка АН БССР М. П. Яругіна. Гэта забяспечвае кваліфікаванае кіраўніцтва навуковым пошукам маладых даследчыкаў і дазваляе вызначыць адну са спецыялізацый на механіка-матэматычным факультэце нашага універсітэта.

З некаторымі праблемамі нас пазнаёмілі супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта В. І. Міроненка і А. П. Садоўскі на пасяджэннях навуковага семінара па дыферэнцыяльных ураўненнях пры кафедры матэматычнага аналізу. Адзін з вучняў доктара фізіка-матэматычных навук прафесара Ю. С. Багданава В. І. Міроненка паспяхова вывучае клас «укладаемых сістэм», што дазваляе ў некаторых выпадках звесці цяжкія пытанні даследавання нелінейных дыферэнцыяльных ураўненняў да больш вывучаных лінейных сістэм.

А. П. Садоўскі расказаў аб вядомай у якаснай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў праблеме цэнтра і фокуса.

Жывы інтарэс выклікаў семінар у шматлікай аўдыторыі студэнтаў, якія прысутнічалі на яго пасяджэннях. Удзельнікі семінара далі высокую ацэнку дакладам і выказалі удзячнасць нашым гасцям з БДУ за змястоўныя і цікавыя паведамленні. Несумненна, работа семінара прыцягне да навукі найбольш здольных нашых студэнтаў.

А. ЮШЧАНКА,
кандыдат фізіка-матэматычных навук.

МААДОЕ ПАПАЎНЕННЕ

З 11 па 15 мая у нашым універсітэце праходзіла размеркаванне выпускнікоў на месцы іх будучай работы. Гэта вельмі важны момант як у жыцці маладых спецыялістаў, так і усяго універсітэта. Аб тым, як праходзіла размеркаванне, карэспандэнт «Гомельскага універсітэта» запытаўся у старшыні камісіі па размеркаванню, рэктара універсітэта, члена-карэспандэнта АН БССР Уладзіміра Аляксеевіча Белага.

— Уладзімір Аляксеевіч, раскажыце, калі ласка, куды размяркоўваюцца выпускнікі ГДУ ў гэтым годзе?

— Выпускнікі нашага універсітэта сёлета паедуць працаваць у раёны Гомельскай вобласці, у іншыя месцы Беларусі і нават у Туркменію. Запатрабаванні на нашых выпускнікоў прыйшлі не толькі з Міністэрства асветы БССР, але і з многіх вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, навукова-даследчых інстытутаў.

— Чым, на Ваш погляд, адрозніваецца сёлетняе размеркаванне ад мінулагодняга?

— Мне вельмі прыемна адзначыць павышэнне ідэйна-палітычнага узроўню цяперашніх выпускнікоў. Бачна, што яны добра разумеюць адказнасць, якая кладзецца на плечы маладога спецыяліста. Многія студэнты выказалі жаданне працаваць там, дзе яны найбольш патрэбны. Наогул размеркаванне праходзіць на высокім узроўні.

— І апошняе пытанне. Што б Вы хацелі пажадаць маладым спецыялістам у іх самастойнай працы?

— Жадаю выпускнікам вялікіх поспехаў у творчай рабоце, высока нясці гонар і сцяг Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Жадаю добрага шляху і вялікага асабістага шчасця!

* * *

Назаўсёды застанецца у памяці выпускнікоў нашага універсітэта дзень, калі яны, усхваляваныя, ва урачыстай абстаноўцы атрымалі накіраванне на работу. Аб тым, якія пачуцці валодаюць імі перад уступленнем у самастойнае жыццё і як яны уяўляюць сабе сваё будучае, запытаўся карэспандэнт «Гомельскага універсітэта» ў маладых спецыялістаў. Вось іх адказы.

Аляксандра ПАШЭК (фізічны факультэт):

— Я накіравана на працу ў Светлагорскі раён. Размеркаваннем задаволена. Лічу, што усюды працаваць трэба з поўнай аддачай сіл. Толькі тады ад гэтага будзе нейкая карысць. Таму для мяне нават не стаяла пытанне: «Дзе працаваць?» Вось толькі шкада развітвацца з універсітэтам, з сябрамі, з горадам, які вельмі палюбіла.

Я люблю сваю прафесію настаўніка, люблю дзяцей. Не ведаю, як складзецца мая работа, але пастараюся зрабіць усё, што ад мяне залежыць, каб мае будучыя вучні сталі сапраўднымі людзьмі.

Васіль КІЧКО (факультэт фізічнага выхавання):

— Мне аказалі вялікае давер'е: я буду працаваць дырэктарам дзіцячай спартыўнай школы у раённым цэнтры Акцябр. ДСШ там існуе толькі першы год, і я думаю, што работы будзе шмат, ды мяне гэта не палохае. Хвалюе толькі недахоп вопыту. Спадзяюся, што мясцовае спартыўнае кіраўніцтва будзе аказваць нам належную дапамогу.

Аляксандр СУВОРАЎ (факультэт фізічнага выхавання):

— Буду працаваць на кафедры лёгкай атлетыкі універсітэта. Зараз цяжка сказаць, як складзецца мая будучая работа, але спадзяюся, што педагагічная практыка, якую мы праходзілі у школе, дапаможа мне у самым пачатку маёй дзейнасці. Шкада, вядома, назаўсёды развітацца са студэнцкім жыццём, але ж уперадзе нас, выпускнікоў, чакае не менш цікавая працоўная дзейнасць.

Інтэрв'ю правяла
Т. ЯКУШАВА.

На здымку: выпускнікі механіка - матэматычнага факультэта у час размеркавання на работу.

Фота А. Рудчанкі.



ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

● Выкладчыкі кафедр грамадскіх навук універсітэта прымаюць актыўны удзел у прапагандзе ленінскай тэарэтычнай спадчыны. З 1 снежня 1969 года для працоўных горада і вобласці было прачытана 562 лекцыі, у тым ліку на кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізма—266, філасофіі — 170, палітэканоміі —126.

● Нашым спартсменам ёсць чым ганарыцца. Кандыдатамі у члены зборнай алімпійскай каманды СССР названы 6 студэнтаў ГДУ. Гэта трэцякурснікі факультэта фізічнага выхавання Ю. Горскі, М. Гольцаў, В. Хомчанка, В. Жданаў, другакурснікі Я. Гаурыленка і В. Наумыка.

● Абсалютная паспяховасць па універсітэту у прайшоўшую зімовую экзаменацыйную сесію склала 93,1 працэнта, тады як у зімовую сесію мінулага навучальнага года яна складала 90,5. Найбольш высокая паспяховасць на гісторыка-філалагічным факультэце—99 працэнтаў.

● За мінулы год у ГДУ прыехала многа высокакваліфікаваных спецыялістаў — дактароў і кандыдатаў навук па розных спецыяльнасцях. Ва універсітэце ўжо працуе каля 100 выкладчыкаў з вучонымі ступенямі, у тым ліку 12 дактароў навук, прафесараў. У бліжэйшы час у ГДУ прыедуць і пачнуць працаваць дактары навук на кафедрах хіміі, механікі, геалогіі, палітэканоміі і г. д. Мяркуецца, што да пачатку новага навучальнага года у нас будзе працаваць каля 20 дактароў навук, прафесараў.

● У гэтым годзе Дзяржаўны інстытут праектавання вышэйшых навучальных устаноў у Маскве прыступіў да праектавання нашага універсітэцкага гарадка, які размесціцца у маляўнічай лукавіне Сожа у раёне Валатавы. Побач з універсітэцкім гарадком будзе праектавацца акадэмічны гарадок філіяла Беларускай Акадэміі навук. Такім чынам, у раёне Валатавы вырасце грандыёзны комплекс, які будзе ўвасабляць яднанне навукі і падрыхтоўкі кадраў па прыкладу лепшых айчынных і замежных навукова-універсітэцкіх цэнтраў.

● Ва універсітэце усе шырэй разгортваецца навукова-даследчая работа на гаспадарча-дагаворных асновах з калгасамі і прамысловымі прадпрыемствамі. Работы вядуцца па наступных тэмах:

Даследаванне характарыстык і уласцівасцей палімерных пакрыццяў плёнак аптычнымі і спектральнымі метадамі.

Праграміраванне геолага-прамысловай інфармацыі з мэтай збірання, захоўвання і апрацоўкі яе на ЭВМ.

Даследаванне шляхоў павышэння эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Вызначэнне відавога саставу і шчыльнасці засялення глебаў глебанасяляючымі шкоднікамі па палях севазвароту з рэкамендацыяй мер барацьбы.

● Студэнты перадалі падшэфным сельскім школам больш 2 тысяч кніг, абсталявання больш чым на 5 тысяч рублёў, зроблена і перададзена вялікая колькасць наглядных дапаможнікаў, аказана дапамога у арганізацыі і правядзенні Ленінскага заліку, праведзены вечары прафтэхарыентацыі у школах і інш.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

УСАЕД ЗА РАМАНТЫКАЙ

Не за гарамі лета — пара студэнцкага працоунага семестра. Зноў паедуць нашы рабяты туды, дзе «будоулі грукочуць у водбліскаў шызых», дзе «нервы нацягнуты, як струна», дзе патрэбны дужыя рукі, малады запал і ударная праца.

Вось ужо некалькі год запар хлопцы і дзяучаты нашага універсітэта едуць услед за рамантыкай на «перадавую» працоунага фронту. Так, у мінулым годзе на будоулях Беларусі працавалі 210 нашых студэнтаў, усяго 8 атрадаў. Імі было асвоена 350 тысяч рублёў капіталаукладанняў. Добрую славу пакінулі пасля сябе атрады «Брыганціна» (камандзір Г. Кончыц) і «Арыён» (камандзір М. Кручкоў). На абласным аглядзе студэнцкіх будаунічых атрадаў яны занялі адпаведна 1-е і 2-е месцы. Добра папрацавалі і іншыя нашы атрады.

У гэтым годзе нам патрэбна сфарміраваць і адправіць на будоулі 20 атрадаў агульнай колькасцю 460 чалавек. Асноуны выбар штаба працоуных спрау універсітэта упау на фізічны факультэт і факультэт фізічнага выхавання, дзе сканцэнтравана асноуная колькасць хлопцаў. Трэба адзначыць, што на фізічным факультэце ужо сфарміраваны поунасцю амаль усе атрады, падабраны камандзіры і камісары, заключаны дагаворы. Асабліва добра ідуць справы у атрадах, дзе камандзіры Л. Арцёменка, Г. Кончыц, А. Язэпава, Б. Голад. З гэтага факультэта запланавана адправіць на ударныя аб'екты меліярацыі і сельскага будауніцтва 200 чалавек.

В. КАСЮК,
начальнік штаба працоуных спрау універсітэта.

ДВУХГОДКА Ў ДЗЕЯННІ

Паспяхова выконвае пастанову ЦК ВЛКСМ аб дапамозе сельскім школам камсамольская арганізацыя біёлага-глебавага факультэта. Гэта дапамога з'яуляецца вялікай і разнастайнай.

У мінулым годзе, напрыклад, у падшэфную сяредняю школу у вёсцы Халочча Чачэрскага раёна выязджала група выкладчыкаў кафедр факультэта. Там яны правялі «Агеньчык», на якім адбылася шчырая размова са школьнікамі аб выбары будучай прафесіі, аб жыццёвым шляху маладога чалавека, атрымаўшага сярэднюю адукацыю. Была праведзена і іншая работа.

Камсамольцы факультэта сабралі і перадалі ў школьную бібліятэку больш 200 кніг, у тым ліку шматлікія дапаможнікі па заалогіі, батаніцы, анатоміі і фізіялогіі чалавека. Хімічны кабінет быў папоунен вялікай колькасцю хімічных рэактываў.

У камітэце камсамола факультэта вялікія планы па далейшаму удзелу ў двухгодцы «Камсамол—сельскай школе». Трэба спадзявацца, што у гэтай справе будуць дасягнуты новыя поспехі.

М. БАЙДА,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

НА ЗДЫМКУ: выступае танцавальны калектыў універсітэта.

ПОСПЕХІ РАДУЮЦЬ

З кожным годам растуць дасягненні спартсменаў нашага універсітэта. Яны набываюць вядомасць не толькі ў нашай краіне, але і далека за яе межамі. Прыемна уведамляць тое, што поспехі калектыву ГДУ у развіцці спартыуна-масавай работы адзначаны у знамянальны час, у год ленінскага юбілею. Вось яны, сведчанні нашых дасягненняў:

— Камітэт па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР узнагародзіу Гомельскі дзяржаўны універсітэт дыпломам 3-й ступені па выніках удзелу у круглагадавой спартакіядзе БССР 1969 года, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

— Камітэт па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР узнагародзіу факультэт фізічнага выхавання ГДУ Граматай за актыуную і плённую работу ў 1969 годзе па аказанню шэфскай дапамогі сельскім калектывам фізічнай культуры.

— Выканком Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў працоуных узнагародзіу Ганаровай граматай калектыу ГДУ за лепшыя паказчыкі у гарадскім аглядзе-конкурсе спартыуна-масавай работы, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

— Абласны камітэт фізічнай культуры і спорту узнагародзіу калектыу ГДУ Ганаровай граматай за поспехі, дасягнутыя у падрыхтоўцы спартсменаў высокай кваліфікацыі.

— Беларускі рэспубліканскі Савет СДСТ «Буравеснік» узнагародзіу калектыу ГДУ дыпломам і прызам за 2-е месца ў аглядзе-конкурсе ВНУ БССР.

Нядаўна з Масквы атрымана радасная вестка — Цэнтральны Савет СДСТ «Буравеснік» і Камітэт па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР узнагародзілі калектыу нашага універсітэта пераходным Чырвоным сцягам і Ганаровай граматай за першае месца у аглядзе-конкурсе спартыуна-масавай работы сярод універсітэтаў Савецкага Саюза.

НА ЗДЫМКАХ: момант сустрэчы каманд БДУ і ГДУ на першынство ВНУ па баскетболу; на занятках у секцыі мастацкай гімнастыкі.

Фота **А. Рудчанкі.**



КАНДЫДАТЫ Ў АЛІМПІЙСКУЮ

Трэцякурснік факультэта фізічнага выхавання Віктар Жданаў і другакурснік гэтага ж факультэта Яуген Гаурыленка узнагароджаны юбілейнымі медалямі «За працоуную доблесць» у азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Такая высокая ацэнка іх спартыўных дасягненняў. І гэта заканамерна, бо многа патрабуецца ад чалавека нрацавітасці, вытрымкі, доблесці і сапраўднага гераізму, каб дасягнуць значных вынікаў у сучасным спорце.

Нялёгкім быу спартыуны шлях Віктара Жданава. У 16 год ён заслужыу званне майстра спорту СССР па сучаснаму пяціборству. Дарэчы, гэта вельмі складаны від спорту, часам звязаны з рызыкай для жыцця. Ён неаднаразова атрымліваў сур'ёзныя траумы, але настойліва працягваў удасканальваць сваё спартыунае майстэрства. Віктар стаў чэмпіёнам юнацкіх гульняў краіны. У складзе зборнай СССР ён выязджаў у 1969 годзе у Будапешт на першынство свету. Аднак захварэу. Зараз пасля аперацыі ён знаходзіцца на лячэнні. Віктар не паддаецца хваробе, як некалі траумам, і не збіраецца складваць спартыуную зброю.

Значныя спартыуныя поспехі у Яугена Гаурыленкі. Ён майстар спорту СССР у бегу на 400 метраў з бар'ерамі, чэмпіён Еўропы сярод юніёраў 1968 года у Лейпцыгу, удзельнік міжнародных сустрэч, член зборнай каманды Савецкага Саюза.

Знаходзячыся часта у раз'ездах, трэніруючыся не менш 3 гадзін штодзённа, ён не развіваецца з кнігай. Яуген любіць кіно, тэатр, музыку. Ён выдатнік вучобы. Таварышы любяць гэтага чулага, сціплага хлопца.

Так, ёсць у каго браць прыклад іншым студэнтам факультэта і універсітэта.

А. ФЯСЬКОЎ,
старшы выкладчык.

Калонка паэзіі

Т. ЦЫГАНКОВА, студэнтка чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

ШЧАСЦЮ ТРЭБА З КАЛЫСКІ ВУЧЫЦЦА

Я жыццё пачынала з казкі
І са звону палескіх крыніц,
З мацярынскае цёплае ласкі
І са светлых над полем зарніц.

Мне казалі: не плач ніколі,
Вер у сілу тых добрых людзей,
А напоўніцца сэрца болем —
Не губляй усё роўна надзей.

Сцісні вусны, калі навальніца
Б'е па свету твайго пачуцця!
Шчасцю трэба з калыскі вучыцца —
У гэтым—сэнс і закон жыцця.

* * *

М. БАШЛАКОЎ, студэнт другога курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

РУКІ МАЦІ

Сівер ветру на іх,
Ад працы цяжкай мазалі
На далонях грубых,
Бы барозны, маршчыны лягі.

Да змяркання
Яны працуюць у полі,
Вуснам росных світанняу
Падстауляюць далоні.

Сырадоем, духмяным
Хлебам пахнуць яны.
Усім, таким звыклым і родным,
Потам, што не змываюць дажджы,

Пахнуць матчыны рукі
Сонцам, небам, грымотамі,
Пахнуць водарам сена,
Пахнуць рукі турботамі.

ТРОЙКА

Сіні снег,
Рускі смех,
Конскі цокат.
Ветру рокат,
Адгалоскі.
Вескі, вескі
Пралятаюць,
Далячыні.
За санямі
Уецца іней.

Коні, коні
Абвясцілі
Звонам гоні,
Праняслісяя
І расталі.
Толькі бомы
Шчэ гучалі
Па-над санна-арбітай
Конскім цокатам
капытаў.

* * *

Л. ПРЫШЧЭПАВА, студэнтка чацвёртага курса біёлага-глебавага факультэта.

БЕЛОРУССИИ ОБЯЗАНА

Синим морем цветущих льнов,
Сотней сказок, мамой рассказанных,
Светлым образом детских снов
Белоруссии я обязана.

И отцовским счастливым лицом,
Первым словом, невнятно сказанным,
И приветливым школьным крыльцом
Белоруссии я обязана.

И сплетеньем кленовых ветвей,
И ревущими гулко МАЗами,
И крылатой мечтой своей
Белоруссии я обязана.

И глазами с голубизной,
И кудрями своими русыми,
И двадцатой своей весной
Я обязана Белоруссии.

АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ

ТОЛЬКІ ПА СВЯТАХ

У артыкуле «З чаго пачаць» У. І. Ленін вызначыў задачы нашага друку. Ён пісаў: «Газета — не толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар».

Прыводзячы гэтыя ленінскія словы, не скажаш, што некаторыя рэдкалегіі насценных газет універсітэта забыліся пра сілу друкаванага слова. Але на многіх факультэтах газеты выходзяць толькі па святах.

Газета «Хімік» (орган партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыі хімфака) увогуле нядрэнная, ёсць шмат добрых матэрыялаў. Цікава вядзецца размова пра будаўнічыя студэнцкія атрады, паспяховасць і г. д. Але прасочым за перыядычнасцю газеты. У гэтым навучальным годзе выйшлі пяць нумароў: да гадавіны Кастрычніка, Дня Канстытуцыі, Новага Года, Дня Савецкай Арміі, 8 Сакавіка. Гэта не так дрэнна, аднак трэба памятаць не толькі пра святы, але і пра будзённыя дні.

Зразумела, і у святочным нумары можна публікаваць, як робіць гэта «Хімік», будзённыя матэрыялы. Пісаць пра дзень Савецкай Арміі і тут жа змяшчаць гумарыстычнае апавяданне пра футбалістаў, заметкі пра адсутнасць вады, няспраўнасць ліфта. Але калі нумар прысвечан якому-небудзь святу, то лепш было б, на наш погляд, усяму яму быць святочным. Інакш, нават калі у газеце будуць публіцыстычныя выступленні, яна згубіць сваё аблічча, перастане быць надзённай і не зможа выконваць трыадзіную задачу, якую паставіў перад друкам У. І. Ленін.

Вызначаецца навагодні нумар «Хіміка». Ён добра афармлен, ёсць тут шмат гумарыстычных замалёвак. Газета прысвечана цалкам навагодняму святу.

Стала традыцыяй у святочных нумарах выступаць з перадавымі артыкуламі. Напрыклад, у нумары, што выйшаў да Дня Канстытуцыі, змешчан матэрыял студэнта Ф. Каргельса. Займае ён амаль пятую частку газеты. Перадавы артыкул патрэбен, але навошта перапісваць яго з агульнапалітычнай газеты ці часопіса, ды яшчэ у такіх вялікіх памерах? Перадавіца павінна будавацца на фактах з жыцця факультэта, а большасць матэрыялаў—расказваць пра справы факультэцкія.

...Газета выйшла, ля яе натоўп чытачоў, але не больш як адзін-два дні, а потым, аж да наступнага свята, да яе ніхто не падыходзіць. А колькі цікавых і хвалюючых падзей адбываецца за гэты час на факультэце! Чаму не расказаць пра іх?! Для гэтага трэба толькі адмовіцца ад практыкі выпускаць газету да свят.

Некалькі гадоў назад «Хімік» выходзіў часта, невялікім фарматам. Цяпер размер газеты значна павялічыўся, перыядычнасць адпаведна паменшылася, аднак чытачы ад гэтага не выйграли. Зусім не!

І. СНЕГУР.

БЕЛАРУСКІ ЛЕС.

УЗНАГАРОДА ЗА СТАРАННЕ

Іх, здаецца, падмянілі. Учора яшчэ усе сядзелі на лекцыях, выступалі, спрачаліся на семінарах, здавалі залікі. А сёння— жарты, смех, песні.

З такім настроем студэнты другога курса II групы факультэта журналістыкі адпраўляліся ў Брэст на экскурсію. Гэта група выйшла пераможцай у аглядзе-конкурсе, прысвечаным ленінскаму юбілею, і прафкам універсітэта узнагародзіў яе першай прэміяй. Атрыманыя грошы аднадушна вырашылі выкарыстаць для паездкі у Брэст, да бессмяротнай цытадэлі над Бугам.

Куратар групы Міхаіл Якаўлевіч Куцэнка і староста Федзя Сагановіч дамовіліся з аўтапаркам наконт аўтобуса, дэталёва распрацавалі маршрут паездкі.

...Некалькі прыпынкаў у дарозе, якія увойдуць у летапіс групы сваёй непаўторнасцю. І вось нарэшце Брэст. Студэнтаў да дробязей цікавіла усё: гістарычнае мінулае старажытнага горада і яго сённяшні дзень. Аб крэпасці-герою кожны многае ведае, аб ёй чыталі. А вось бачыць не ўсім давялося. Таму і зразумела тая уважлівасць, з якой углядаліся усе у непрыступныя, пашчэрбленыя снарадамі і кулямі сцены крэпасці, чыталі на іх гістарычныя надпісы, баючыся прапусціць хоць адно слова, слухалі экскурсаводаў. Занатоўвалі свае ўражанні у блакноты, фатаграфавалі помнікі бяспрыкладнай мужнасці савецкіх пагранічнікаў.

Начавалі каля крэпасці у палатках. Урачыста-спакойны плёскат вады у Бузе, сумнаватажалобны шум над ім вербалозаў і жыццесцвярджальны пошчак салаўя слухалі, нібы рэквіем загінуўшым абаронцам.

На досвітку развіталіся з крэпасцю. Шлях далей пралёг у Белавежскую пушчу — жамчужыну беларускай прыроды. Сустрэча з жывым уладаром пушчы — зубрам надоўга застанецца у памяці. У Камянцы студэнты агледзелі вядомую Белую вежу, любаваліся помнікамі архітэктуры.

Па дарозе назад спынілася у Кобрыне, наведалі музей вялікага рускага палкаводца Аляксандра Васільевіча Суворава.

Тысячамі агнёў свеціўся Мінск, калі экскурсанты вярталіся дадому. Паездка у Брэст удалася. Студэнты аб многім даведаліся, многае пабачылі, перажылі хвалюючыя мінуты ля апаленых вайной сцен цытадэлі, бліжэй пазнаёміліся з выдатнымі мясцінамі роднага краю. За сваё старанне у вучобе і грамадскай рабоце студэнты атрымалі прыемную, карысную узнагароду. А свядомасць надалей акрыялі думкі: і у гэту сесію не спасаваць. У тым, што гэта заманлівая і карысна, на справе пераканаліся.

А. ПЯТРОЎ.

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

АРГАНІЗАТАР ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ

ВЫДАВЕЦТВА БДУ выпусціла у свет кнігу дацэнта нашага універсітэта М. В. Рожына «Газета «Северо-Западный край». Гэта, па вызначэнню аутара, нарыс грамадска-палітычнай, філасофскай і эстэтычнай пазіцыі газеты за ўвесь час яе існавання — з 1902 па 1905 год. «Северо-Западный край» яшчэ раней прыцягваў увагу даследчыкаў, у прыватнасці, В. У. Івашына, С. І. Карабана, І. І. Казекі і іншых. Але ў іх навуковых працах разглядалася дзейнасць газеты толькі у апошні год яе існавання. У новым жа даследаванні М. В. Рожына зроблена удалая спроба прасачыць увесь шлях «Северо-Западного края», паказаць эвалюцыю газеты ад буржуазнага дэмакратызму да марксізма, даць аналіз яе палітычнай, сацыяльнай і эстэтычнай праграм, звязаць іх з пэўнымі філасофскімі школамі і напрамкамі, з развіццём грамадскага руху у Расіі і Беларусі. Гэтым самым аутар здолеў вызначыць ролю газеты у станаўленні рэвалюцыйнай свядомасці і развіцці нацыянальнай культуры беларускага народа. Значнае месца у кнізе адводзіцца даследаванню работы «Северо-Западного края» па прапагандзе марксісцка-ленінскай тэорыі і раскрыццю барацьбы супраць дробнабуржуазнай ідэалогіі.

У пачатку кнігі М. В. Рожын дае станоучую ацэнку «Минскому листку» (1886—1902), на змену якому была створана газета «Северо-Западный край».

Гісторыю газеты М. В. Рожын умоўна падзяляе на два перыяды, размежаваныя рэвалюцыйным уздымам 1905 года. Першы перыяд працягваў традыцыі «Минского листка» і не быў акрэсленым і паслядоўным у палітычных і тэарэтычных адносінах. На старонках газеты змяшчаліся адкрыта ліберальныя артыкулы. Па меры нарастання класавых баёў «Северо-Западный край» усё больш схіляўся у бок пралетарскага дэмакратызму і ператварыўся да пачатку рэвалюцыі 1905 года у легальную трыбуну сацыял-дэмакратычных і рэвалюцыйных сіл Беларусі. Але і у 1902—1904 гадах «Северо-Западный край» «...у цяжэйшых умовах цэнзурнага прыгнёту па меры сіл, магчымасцей і разумення... пістарычнай абстаноукі адстайваў эканамічныя інтарэсы самых шырокіх народных мас, змагаўся за правядзенне у жыццё ідэй гуманізму, верацярпімасці, грамадзянскага і нацыянальнага раўнапраўя, настайваў на неабходнасці адукацыі народных мас, патрабаваў дэмакратызацыі існуючых форм грамадскага жыцця і г. д....»

Пісьмы і карэспандэнцыі людзей самых розных прафесій ішлі у рэдакцыю з усіх куткоў Беларусі і Літвы. Значнае месца у газеце займаюць у гэты перыяд пытанні, звязаныя з дзейнасцю так званых камітэтаў па патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці. З нумара у нумар, на працягу усёй работы гэтых камітэтаў газета змяшчала матэрыялы, якія асвятлялі прававое і эканамічнае становішча сялян.

У той жа час друкаваліся матэрыялы, якія сведчылі аб ваганнях «Северо-Западного края» паміж крытыкай урада і апеляцыяй да яго.

Паглыбленыя інтарэсы аутара кнігі ў галіне філасофіі наклалі пэуны адбітак на яго працу. М. В. Рожын асвятляе асобныя пытанні філасофскай думкі пачатку XX стагоддзя, дэталёва аналізуе барацьбу розных напрамкаў у сацыял-дэмакратыі, прасочвае адлюстраванне гэтай барацьбы на старонках «Северо-Западного края». Такі метад апрауданы, бо дазваляе чытачу пранікнуцца духам часу і больш поўна уявіць сабе тыя супярэчнасці, якія мелі месца у тагачаснай Расіі.

Матэрыялы, змешчаныя у газеце, М. В. Рожын разглядае падрабязна, каб даць магчымасць чытачу самому разабрацца у сітуацыі, што склалася напярэдадні першай рускай рэвалюцыі. Аутар аналізуе гэтыя матэрыялы з пункту гледжання іх карыснасці рэвалюцыйнаму руху, супастауляе іх і вырысоувае перад чытачом агульную карціну дзейнасці «Северо-Западного края». М. В. Рожын дэталёва разбірае артыкул Л. І. Аксельрод, які быў адным са звенняў агульнай тэарэтычнай барацьбы рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі супраць кантыянцтва. Змяшчэнне яго у «Северо-Западном крае» ясна паказвае, на думку даследчыка, поунае размежаванне газеты з ліберaламі. Аб падтрымцы газетай ленінскай тактыкі у рэвалюцыйным руху сведчыць артыкул «О профессиональных союзах», цалкам перадрукаваны з ленінскага «Пролетария». М. В. Рожын сцвярджае — і нельга з ім не згадзіцца,— што перадрукаванне на старонках легальнай беларускай газеты гэтага артыкула прынесла вялікую карысць рэвалюцыйнаму пралетарыяту Беларусі, бальшавіцкім партыйным арганізацыям у справе абгрунтавання і прапаганды тактычнай лініі бальшавікоу у адносінах да прафесіянальнага руху.

Асобна хацелася б сказаць пра трэці раздзел кнігі, дзе аутар разважае аб прапагандзе і развіцці рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі у газеце. Даследчык на падставе фактычнага матэрыялу даводзіць, што асноўнай тэндэнцыяй газеты было засваенне традыцый эстэтыкі рускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў, і робіць вывад: газета з'явілася трыбунай перадавой эстэтычнай думкі Беларусі. Яна шырока прапагандавала імёны класікаў рускай літаратуры— Пушкіна, Гогаля, Някрасава, Бялінскага, буйнейшых пісьменнікаў-сучаснікаў — Чэхава, Караленкі, Горкага, станоуча ацэньвала іх творчасць. У той жа час газета рэзка выступала супраць антырэалістычных тэндэнцый у літаратуры і мастацтве. Даследчык аналізуе адносіны «Северо-Западного края» да дэкадэнцкіх літаратараў — А. Вярбіцкай, С. Юшкевіча, Л. Андрэева, паказвае паступовы пераход газеты да разумення антыграмадскага, рэакцыйнага характару тэарэтычных асноў і самой творчасці дэкадэнтаў.

М. В. Рожын адзначае вялікую ролю газеты у развіцці нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа. Нягледзячы на строгую забарону, накладзеную царскім самадзяржаўем на беларускае слова у 1867 годзе, «Северо-Западный край» друкаваў на сваіх старонках творы вуснай паэзіі беларускага народа на яго роднай мове. У маі 1905 года у газеце быў змешчан першы верш Янкі Купалы «Мужык». Нельга не пагадзіцца з думкай даследчыка аб тым, што барацьба «Северо-Западного края» за права беларускага народа на сваю мову была каштоуным укладам у нацыянальна-вызваленчы рух, а верш «Мужык» звязаў газету з усім далейшым развіццём беларускай літаратуры.

Кніга М. В. Рожына пакідае добрае ўражанне. У ёй на падставе фактычнага матэрыялу дадзена грунтоуная ацэнка розным этапам дзейнасці газеты, дэталёва разбіраюцца артыкулы, змешчаныя у асобных яе нумарах. На прыкладзе газеты аутар прасочвае паступовае узрастанне рэвалюцыйнай свядомасці працоуных мас Беларусі напярэдадні першай рускай рэвалюцыі 1905-1907 гадоў. У кнізе шырока выкарыстаны матэрыялы архіуных сховішчаў нашай краіны, хоць архіу самой газеты да цяперашняга часу не знойдзен. Новая кніга М. В. Рожына уносіць добры уклад у асвятленне гісторыі грамадскай думкі Беларусі пачатку XX стагоддзя.

В. ШЫХАНЦОУ,
студэнт факультэта журналістыкі.



МАЛЕНЬКІ ДРАПЕЖНІК. Фотаэцюд С. Супруна.

Згублены студэнцкі білет, выдадзены Беларускім дзяржаўным універсітэтам на імя **Аутушкі** Міхаіла Іванавіча за № 680944, лічыць несапраўдным.

Згублены студэнцкі білет, выдадзены Беларускім дзяржаўным універсітэтам на імя **Маркача** Васіля Сяргеевіча за № 680972, лічыць несапраўдным.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 23173. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 732.